— справаздачу аб правядзенні пазакласнага мерапрыемства.

Трэці этап — творчая практыка (V курс).

На гэтым этапе студэнты далучаюцца да працэсу пастаноўкі вучэбнага спектакля: яны дапамагаюць рэжысёру-пастаноўшчыку ў якасці рэжысёра-педагога.

У выніку гэтага этапу практыкі студэнт прадстаўляе:

— сцэну са спектакля, падрыхтаваную юнымі выканаўцамі пад кіраўніцтвам рэжысёра-пастаноўшчыка;

— творчую характарыстыку выканаўцаў з ацэнкай іх прафесійных перспектыў.

Такім чынам, педагагічная практыка студэнтаў рэжысёрскіх спецыяльнасцей можа і павінна стаць выніковым этапам прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў. Нават калі ў працэсе педпрактыкі стане ясна, што ў студэнта адсутнічаюць здольнасці, якія патрэбны пры рабоце з дзецьмі, гэта таксама карысны вынік.

Прафесійная праца ў галіне тэатральнай творчасці дзяцей і моладзі паспрыяе ўвогуле творчаму росту акцёрскіх і рэжысёрскіх кадраў у нашай краіне.

**Р.С.Матульскі,**
**дацэнт Беларускага універсітэта культуры**

## РЭАЛІЗАЦЫЯ АСНОЎНЫХ ПАЛАЖЭННЯЎ ДЗЯРЖАЎНАГА СТАНДАРТА ПА СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ "БІБЛІЯТЭКАЗНАЎСТВА І БІБЛІЯГРАФІЯ" НА ПРАКТЫЦЫ

Дзяржаўны адукацыйны стандарт па спецыяльнасці "бібліятэказнаўства і бібліяграфія" прадугледжвае праходжанне студэнтамі за перыяд навучання ў ВНУ азнаямленчай (вучэбнай), вытворчай (тэхналагічнай) і пераддыпломнай практыкі. Падчас практыкі студэнт павінен пазнаёміцца з рознымі накірункамі дзейнасці бібліятэк, замацаваць атрыманыя тэарэтычныя веды, набыць практычныя навыкі і ўменні, неаб-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ходныя для выканання функцыянальных абавязкаў бібліятэкара-бібліёграфа ў бібліятэчна-інфармацыйных установах розных тыпаў.

Першае знаёмства студэнтаў з бібліятэкамі адбываецца пры вывучэнні курса "Уводзіны ў спецыяльнасць". На практычных занятках па курсе студэнты могуць наведаць асноўныя тыпы бібліятэк, у тым ліку абавязкова — публічную, школьную, навукова-тэхнічную. Мэта такіх заняткаў — сфарміраваць уяўленне аб бібліятэцы як сацыяльным інстытуце, аб яе тыпах, структуры, асноўных накірунках дзейнасці, стварыць аснову і матывацыю вывучэння спецыяльных дысцыплін.

Знаёмства студэнтаў з бібліятэкамі працягнецца падчас азнаямленчай практыкі, якое адбываецца паралельна з вывучэннем курса "Бібліятэказнаўства: тэорыя". Пасля заканчэння курса студэнты павінны ведаць сутнасць бібліятэкі як сацыяльнага інстытута, прынцыпы яе дзейнасці, тыпалогію бібліятэк, іх функцыі, структуру, асноўныя накірункі дзейнасці. Таму студэнты павінны не толькі наведаць бібліятэкі розных тыпаў і атрымаць агульную інфармацыю аб іх дзейнасці, але і папрацаваць у якасці асістэнта бібліятэкара ў розных структурных падраздзяленнях на выкананні працэсаў, якія не патрабуюць спецыяльных прафесійных навыкаў (напрыклад, тэхнічная апрацоўка літаратуры, папярэдняя алфавітная расстаноўка каталожных картак, расстаноўка літаратуры і інш.). Гэта дазволіць замацаваць тэарэтычныя веды, пашырыць веды студэнтаў аб бібліятэчнай дзейнасці, стварыць падмурак для вывучэння такіх спецыяльных дысцыплін, як "Бібліятэчныя фонды", "Каталагізацыя дакументаў", "Абслугоўванне карыстальнікаў", "Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай дзейнасці".

Наступны этап — вытворчая практыка. Факультэту неабходна вярнуцца да старой формы яе арганізацыі і праводзіць вытворчую практыку на працягу трох гадоў: на III курсе, прысвечаную фарміраванню інфармацыйных рэсурсаў; на IV — абслугоўванню карыстальнікаў; а на V — дысцыплінам спецыялізацыі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Практыка па фарміраванні інфармацыйных рэсурсаў можа праходзіць на працягу першых сямі тыдняў шостага семестра пасля завяршэння аўдыторных заняткаў па такіх курсах, як "Каталагізацыя дакументаў", "Бібліятэчныя фонды", "АТБР". Яе асноўныя задачы — замацаванне тэарэтычных ведаў, практычных навыкаў і ўменняў па фарміраванні інфармацыйных рэсурсаў бібліятэк.

Пасля заканчэння аўдыторных заняткаў па такіх курсах, як "Абслугоўванне карыстальнікаў", "Інфармацыйна-бібліяграфічнае забеспячэнне навукова-тэхнічнага і медыцынскага комплексу", "Інфармацыйна-бібліяграфічнае забеспячэнне сацыяльна-гуманітарнага і мастацка-эстэтычнага комплексу", можна прыступіць да правядзення практыкі па абслугоўванні карыстальнікаў. Яна будзе праходзіць на працягу сямі апошніх тыдняў восьмага семестра і павінна ахапіць бібліятэчнае, бібліяграфічнае і інфармацыйнае абслугоўванне карыстальнікаў. Асноўнай мэтай дадзенай часткі практыкі з'яўляецца фарміраванне навыкаў і ўменняў, неабходных для абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк.

Практыкай па фарміраванні інфармацыйных рэсурсаў і абслугоўванні карыстальнікаў павінны кіраваць тыя выкладчыкі, якія чытаюць адпаведныя курсы.

У канцы дзевятага семестра студэнты на працягу шасці тыдняў праходзяць практыку па дысцыплінах спецыялізацыі, падчас якой таксама праводзяць неабходныя даследаванні па тэматыцы дыпломнай работы.

Пасля завяршэння вытворчай практыкі студэнты на працягу дзевяці тыдняў працягваюць тэарэтычныя заняткі, здаюць экзамены па дысцыплінах спецыялізацыі і курсах па выбары і накіроўваюцца на пераддыпломную практыку для завяршэння дыпломнага даследавання.

Змяненне графіка праходжання вытворчай практыкі дазваляе ўдакладніць графік падрыхтоўкі дыпломных прац. Атрымаўшы напачатку вучэбнага года заданне, студэнт з верасня да паловы лістапада працуе над зборам тэарэтычнага матэрыялу, у другой палове лістапада і ў снежні праводзіць даследаванне ў бібліятэцы падчас вытворчай практыкі, з лю-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тага да паловы красавіка ажыццяўляе абагульненне вынікаў даследаванняў, а ў другой палове красавіка і ў маі падводзіць вынікі даследавання, ажыццяўляе іх апрабацыю на студэнцкай навуковай канферэнцыі і пасяджэнні кафедры, афармляе канчатковы варыянт дыпломнай работы.

Прапанаваная арганізацыя праходжання практыкі студэнтамі дазваляе:

— пастулова знаёміць студэнтаў з бібліятэкай, пераходзячы ад простых задач да больш складаных;

— праводзіць на кожным курсе па адной практыцы і такім чынам раўнамерна размяркоўваць вучэбную нагрузку студэнтаў па семестрах;

— праходзіць студэнтамі розных курсаў практыку ў розныя тэрміны;

— раўнамерна размяркоўваць аўдыторныя заняткі на факультэце па семестрах і стабілізаваць нагрузку выкладчыкаў;

— забяспечыць больш эфектыўны кантроль выкладчыкаў за ходам падрыхтоўкі студэнтамі дыпломных работ.

**Т.М. Мікуліч,**
**дацэнт Беларускага універсітэта культуры**

## РОЛЯ ЭТНАГРАФІЧНАЙ ПРАКТЫКІ Ў ПРАЦЭСЕ ПАДРЫХТОЎКІ СТУДЭНТАЎ ПА СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ “МУЗЕЙНАЯ СПРАВА І АХОВА ПОМНІКАЎ ГІСТОРЫІ І КУЛЬТУРЫ”

Беларускі універсітэт культуры ўжо некалькі гадоў рыхтуе студэнтаў па спецыяльнасці “музейная справа і ахова помнікаў гісторыі і культуры”. Студэнты дадзенай спецыяльнасці становяцца перш за ўсё супрацоўнікамі музеяў, а таму музейная практыка з’яўляецца для іх асноўнай. Акрамя музейнай, у план уведзена археалагічная практыка, што цалкам правамерна. Разам з тым значным недахопам вучэбнага плана з’яў-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ